Усе гэтыя веды зближалі і аб'ядноўвалі маці і дзяўчынку, а таксама і ўсіх членаў сям'і, узбагачалі іх унутраны духоўны свет.

Такім чынам, асаблівасці выкладання раздзела "Беларуская абрадавая кухня" ў дысцыпліне "Каляндарна-абрадавыя святы" пры навучанні сацыяльных педагогаў заключаюцца перш за ўсё ў раскрыцці сямейных традыцый у вырашэнні праблемы пераемнасці пакаленняў, працэсу выхавання праз практычны ўдзел дзяцей у культурна-бытавых аспектах падрыхтоўкі свят і абрадаў, што, у сваю чаргу, выхоўвала ў дзіцяці пачуццё неабходнасці захавання, зберажэння і развіцця культурнай спадчыны бацькоў.

Залатар В.А.,
выкладчык

## ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭАТРАЛЬНЫХ ПРЫЁМАЎ У НАВУЧАННІ САЦЫЯЛЬНЫХ ПЕДАГОГАЎ ПА РАБОЦЕ З ДЗЕЦЬМІ

1. Прымяненне некаторых прыёмаў тэатральнага мастацтва ў навучанні сацыяльных педагогаў абумоўлена тым, што пытанні прафесійнай падрыхтоўкі разглядаюцца ў непарыўнай сувязі з задачамі выхавання якасцей творчай асобы, неабходных сацыяльнаму педагогу ў яго будучай рабоце з дзецьмі. Веданне гэтых прыёмаў дазваляе выкладчыку стварыць сваю гнуткую, дыферэнцаваную методыку навучання.

2. Адной з асноўных умоў развіцця творчых здольнасцей студэнтаў з'яўляецца практыкаванне "назіранне". Неабходна дапамагчы студэнту ў творчай рабоце карыстацца багажом, які назапашваецца ў працэсе вывучэння і пазнання жыцця. Размова пойдзе аб сувязі творчага і навучальнага працэсу з жыццём. Для сацыяльнага педагога ўменне назіраць жыццё, выбіраць найбольш цікавае, незвычайнае - прафесійная патрэбнасць. Практыкаванне "назіранне" мяркуецца як трэнінг. У аснове яго ляжыць не фантазія, а рэальны факт, які падгледжаны ў жыцці. Але абавязкова, каб факт усхваляваў бы студэнтаў і па-новаму расказаў аб жыцці, прымусіў бы задумацца аб ім. На занятку пераносіцца ўбачанае ў жыцці, творча перапрацаванае ва ўяўленні. Гэта галоўная ўмова практыкавання "назіранне". У ім утрымліваецца не толькі прынцып навучальна-творчага працэсу, але і прынцып падыходу да прафесіі, якая не існуе без сувязі з жыццём.

3. Адна з асноўных задач навучальнага працэсу - развіццё ў студэнтаў творчага назірання. Трэба ў назіранні выкарыстоўваць уражанні, асацыяцыі, якія сапраўды падказаны жыццём і вучаць студэнтаў уважліва адносіцца да жыцця, дапамагаюць назапасіць эмацыянальны вопыт, тым самым рыхтуючы іх да творчай дзейнасці.

Пры рабоце з практыкаваннем "назіранне" неабходна ўлічваць:

- эмацыянальна-творчы патэнцыял студэнта;
- яго інтэлектуальны ўзровень;
- практычную аснову.

Праблема зместу і выбару матэрыялу для назірання з'яўляецца вельмі важнай, і ад таго, якія тэмы раскрывае з дапамогай іх студэнт, можна меркаваць, якія ў яго інтарэсы.

4. Патрэбны паэтапны трэнінг практыкавання "назіранне":

I этап - сатворчая дзейнасць, асноўная мэта якой - назапашванне ўражанняў і вопыту для творчай дзейнасці, адбываецца пад кіраўніцтвам выкладчыка. На гэтым этапе выкладчык прапануе студэнтам заданні для трэнінгу.

II этап - калектыўна-індывідуальная творчасць, у якой выкладчык кіруе творчай дзейнасцю непрыкметна. Выкананне заданняў ажыццяўляецца ў сумесных творчых зносінах і супрацоўніцтве.

III этап -індывідуальная творчасць. Гэты этап творчага развіцця рэалізуецца не ўсімі студэнтамі. Характарызуецца асэнсаваннем творчага выніку, самастойнасцю, прафесійнай накіраванасцю. Індывідуальная творчасць рэалізуецца праз напісанне арыгінальнага сцэнарыя і ажыццяўленне яго пастаноўкі. Галоўнае бачыцца не толькі ва ўменні выкладчыка навучыць назіранню, але і ў практычнай перадачы ўбачанага ў працэсе творчай работы з дзецьмі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ